# ІНТЭГРАЦЫЯ КАРАЛЕЎСТВА ПОЛЬША І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА: ПРАВАВЫ АСПЕКТ

**А. В. Валеўка**
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права*
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Наваполацк, Беларусь*

Перыяд позняга сярэднявечча і пачатак новага часу ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці і права мы можам ахарактаразаваць па-рознаму. Гэта быў час поўны супярэчнасцяў і вельмі багаты на гістарычныя працэсы, многія з якіх у наш час застаюцца недастаткова вывучанымі.

Период позднего средневековья и начало нового времени в истории белорусской государственности и права мы можем охарактеризовать по-разному. Это было время полных противоречий и очень богато на исторические процессы, многие из которых в настоящее время остаются недостаточно изученными.

The late Middle Ages and the beginning of a new time in the history of the Belarusian statehood and the right we can characterize differently. It was a time full of contradictions and is very rich in historical processes, many of which now remain insufficiently studied.

На працягу XVI ст. ВКЛ было вымушана абараняць свой суверэнітэт у працэсе інтэграцыі з Польскім каралеўствам. Пачатая ў 1385 г. у выніку заключэння Крэўскай уніі інтэграцыя, была працягнута ў наступных пагадненнях.

Аднак імкненне да адметнага месца ў Рэчы Паспалітай і памяць пра “залатыя часы” незалежнасці Княства, а таксама палітычныя амбіцыі некаторых магнацкіх родаў спрыялі пашырэнню з’явы, трактуемай часам як “літвінскі сепаратызм” [2, с. 5]. Тым не менш працэс па сціранню выразнай мяжы паміж шляхтай ВКЛ і Польшчы набываў незваротны характар і праходзіў у напрамку фарміравання адзінага палітычнага народа-шляхты паводле мовы, культуры і каталіцкага веравызнання. Значная рэлігійная і культурная талерантнасць, якая мела месца ў ВКЛ у “залатым” XVI ст., знікла ў працэсе разгортвання контррэфармацыі і паланізацыі. Тыя ж прадстаўнікі пануючага саслоўя, якія стаялі на шляху гэтых працэсаў, трапілі ў разрад “дысідэнтаў”, незадаволеных і непаўнапраўных, што ўскосна паспрыяла знікненню гэтай дзяржавы з палітычнай карты Еўропы [2, с. 5].

З самага пачатку палітычных зносін паміж ВКЛ і Польшчай можна прасачыць імкненне апошняй да дамініруючага палажэння. Па сутнасці акт Крэўскай уніі можна лічыць інкарпарацыяй ВКЛ. Між тым, пачынаючы з 1440 г., калі вялікім князем быў абраны Казімір

Ягелончык, можна казаць аб тэндэнцыі ўмацавання самастойнасці Княства [1, с. 28].

Статут 1529 г. юрыдычна замацоўваў вельмі значныя моманты для захавання суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага [5, с.631]. Так, устанаўлівалася, што ўсе павінны судзіцца "адным правам", а шляхецкія пасады і ўрады будуць давацца «толко прирожоным тубылцом тых земель наших Великого князства» (р.1, арт.9 і інш.). Вялікі князь (гаспадар), абавязаны быў, згодна Статуту, стаяць на абароне тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту ВКЛ [3, с. 520]. Рэгламентавалася: калі з тэрыторыі дзяржавы «што будеть несправедливо отдалено и неслушне разобрано», гэтыя землі павінна «ку панству привернути»), г. зн. вернута да Вялікага Княства (р. 3, арт. 2). Такім чынам, нягледзячы на ўнійныя адносіны, заканадаўчым шляхам замацоўвалася незалежнасць ВКЛ.

Паколькі ВКЛ і Польшча былі звязаны ўніяй і мелі аднаго манарха, у Статуце было замацавана размежаванне кампетэнцыі вялікага князя і караля. Так, варта звярнуць увагу на наступнае палажэнне: "Тэж уставуем, иж от того часу мы сами и потомки наши, будучи в панстве нашом коруне Польской, не маем никому ничего в панстве нашом Великом князьстве Литовском именей, людей и земль давати и первых данин, кому будем дали, потвержати. Нижли мы сами и потомки наши, будучи у Великом князьстве, подданым нашим маем давати и их обдаровати подле их заслуг. А привилев на вечную реч не маем инде никому давати, олиж, кгды будем весполок с паны радами нашими на валном сойме. А так, естли бы хто после тое уставы нашое як-колве в нас люди и земли, кгды будем в Полщи, впросил албо первую данину нашу привилем нашим потвердил, таковые листы и привили наши в ничого оборочаем и не маем мы сами и потомки наши их держати" [4]. Тым самым, закон забараняў манарху распараджацца землямі і маёмасцю ВКЛ, калі ён, маючы пасаду караля, знаходзіўся ў Польшчы. Таксама нельга было яму ад свайго імя даваць каму-небудзь пасады, бо гэта было ў кампетэнцыі паноў-рады і сойма. Такія рашэнні манарха лічыліся незаконнымі. Пануючае саслоў'е ВКЛ усялякімі сродкамі імкнулася забяспечыць свае інтарэсы і абараніць уласныя правы ад замахаў з польскага боку.

Увогуле адлюстраваная ў Статуце 1529 г. ідэя суверэнітэту дзяржавы, з'яўлялася новай у тагачасным заканадаўстве, прычым не толькі ВКЛ, але і многіх іншых дзяржаў. Гэта ідэя была супрацьпастаўлена сярэдневяковаму касмапалітызму, распаўсюджанаму ў тагачаснай Еўропе.

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Пер. М. Раманоўскага і А. Істоміна; прадм. Г. Сагановіча. Мінск, 2002. 459 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2007. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII ст.) / Ю. Бохан [і інш.]. 2007. 344 с.

3. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С. І. Санько [і інш.] ; Нац. акад. Навук Беларусі, Ін-т філасофіі. Мінск : Беларус. навука, 2010. 840 с.

4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi / kanstytutsyynae-prava-belarusi/statuty-vyalikaga-knyastva-lito-skaga/statut-1529-goda/. Дата доступу: 23.05.2019.

5. Юхо Я.А. Статут ВКЛ 1529 г. // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя у 3 т. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2005. Т. 2: Кадэцкі корпус — Яцкевіч. С. 630-632.